# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат Алесі Анатольеўны Носік "Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне", прадстаўленай да абароны на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат Алесі Анатольеўны Носік "Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне" дае выразнае ўяўленне аб структуры і змесце яго дысертацыйнага даследавання. Ён уключае агульную характарыстыку работы, звесткі аб ступені вывучанасці праблемы, актуальнасці і навізне, аб'екце і прадмеце, мэце і задачах даследавання, яго тэарэтычнай і практычнай значнасці, апрабацыі, асноўных палажэннях, якія выносяцца на абарону, а таксама змесце працы і спісе публікацый саіскальніка.

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена антрапацэнтрычным, этнацэнтрычным і кагнітыўным кірункамі даследавання, што рэпрэзентуе эмацыянальную сферу чалавека ў комплексным асвятленні. Мэта і задачы даследавання сфармуляваны ў адпаведнасці з палажэннямі, якія выносяцца на аборону.

У аўтарэфераце вылучаны ўсе структурныя элементы дысертацыйнага даследавання. Аўтарам разглядаюцца найбольш важныя пытанні семантыкі і сфер функцыянавання лексічных адзінак, якія служаць для апісання эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове.

У першай главе разглядаюцца асноўныя напрамкі вывучэння феномена «эмацыянальнасць» у псіхалогіі, сацыялогіі, філасофіі, лінгвістыцы і іншых навуковых сферах. Вывучэнне шырокага спісу навуковых крыніц па лінгвістыцы эмоцый, як айчынных, так і замежных, дазволіла даследчыку вылучыць асноўныя праблемы, сярод якіх адзначаюцца тыпалогія эмоцый, нацыянальна-культурная спецыфіка выражэння эмоцый, крытэрыі эмацыянальнасці мовы і яе знакаў, суадносіны лінгвістыкі і паралінгвістыкі эмоцый, эмацыянальная і эматыўная семантычная прастора апісання выражэння эмоцый і г.д. Другая глава ўключае аналіз і класіфікацыю намінацый адмоўных эмоцый са значэннем гора, гневу, агіды, пагарды, нянавісці, віны, сораму і страху, якія сістэматызаваны па прынцыпе семантычных палёў. У трэцяй главе прадстаўлена сістэматызацыя намінацый станоўчых эмоцый: радасці, цікавасці і здзіўлення; пры гэтым адзначаецца іх нешматлікасць і сінкрэтычнасць.

На падставе інфармацыі, прадстаўленай у аўтарэфераце, праца Алесі Анатольеўны Носік характарызуецца лагічнасцю, паслядоўнасцю моўнага аналізу і абгрунтаванасцю вынікаў. Дакладнасць вынікаў дысертацыі забяспечваецца доказнай тэарэтычнай базай, значным аб'ёмам фактычнага

матэрыялу і яго шматаспектнай інтэрпрэтацыяй. Паслядоўнасць моўнага аналізу, аргументаванаць вынікаў дысертацыі сведчаць пра глыбокае валоданне Алесяй Анатольеўнай Носік як тэарэтычнай базай, так і методыкай навуковага даследавання.

У адпаведнасці з пастаўленымі задачамі дысертант праводзіць комплекснае апісанне лінгвістычнай прыроды эмацыянальных дэфініцый, выяўляе масіўны корпус лексіка-семантычных варыянтаў, праводзіць класіфікацыю эмоцый згодна з прыналежнасцю да той ці іншай часціны мовы (субстантываў, ад’ектываў і дзеясловаў).

Публікацыі аўтара адпавядаюць тэме дысертацыйнага даследавання і забяспечваюць шырокую апрабацыю матэрыялаў. Атрыманыя вынікі з’яўляюцца пацвярджэннем таго, што мэта дысертацыі дасягнута аўтарам у поўнай меры.

Даследаванне Алесі Анатольеўны Носік з’яўляецца самастойным, завершаным навуковым даследаваннем, якое вылучаецца навуковай навізной, відавочнай тэарэтычнай і практычнай значнасцю, у пэўнай ступені фарміруе далейшыя перспектывы для навуковых распрацовак па катэгорыі эмацыянальнасці ў розных мовах. Як сведчаць матэрыялы аўтарэферата, дысертацыя “Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне” адпавядае патрабаванням ВАК і яе аўтар Алеся Анатольеўна Носік заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Загадчык кафедры педагогікі
ДУА "Мінскі гарадскі інстытут
развіцця адукацыі",
кандыдат філалагічных навук, дацэнт В.Г. Наталевіч

Подпись Наталевич В.Г. удостоверяю
специалист по кадрам